Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłata pocztowa uiszczono ryczałtem

ЗА ПРАЦУ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вартаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 7 Вільня, Субота 24-га лістапада 1928 г. Год 1

Не забываймася аб школьных дэкларацыях.

Мінулае лета для беларускага сялянска-работніцкага руху прайшло пад знакам барацьбы з тымі ўхіламі, якія праявілі нядаўнія „вярхі“ ў сувязі з рознымі пасуламі мясцовых дзеячаў з „адзінкі“. Дзякуючы надзвычайнай сьвядомасьці сялянства і работніцтва, дзякуючы энэргіі Беларускага Сялянска-Работніцкага Пасольскага Клюбу, стаўшага на варце інтарэсаў працоўных—*гэтыя ўхілы трэба цяпер лічыць зьліквідаванымі*. Беларускія сялянска-работніцкія гушчы асталіся незачэпленымі гэтымі „ўхіламі“, а споеныя адзінай воляй—яшчэ шчыльней, яшчэ больш сьвядома і рашуча трэбуюць палепшаньня свайго палажэньня, яшчэ больш злучанымі радамі ідуць да свайго вызваленьня.

Тая барацьба, якая прайшла мінулым летам, для многіх была нявідная, для многіх стваралася ўражаньне, што барацьба ідзе з Янкам Станкевічам, некаторыя „прыяцелі беларусаў“ навет пісалі, што мы аж зашмат аддаём яму увагі, сьвядома ня дабачаючы (прыяцелі), што гэты гора - палітык зьяўляўся толькі брудным штандарам, за якім пазваліся розныя „слупы грамадзянства“, як Астроўскія, Каўшы, Чатыркі і інш., каб, пераняўшы працу розных „полёнафілаў“, зьвясьці беларускі сялянска-работніцкі рух з яго праўдзівага шляху, або адкалоць ад яго ўсё, што можна.

Цяпер над імі трэба паставіць крыж. Асьлепленыя сваімі „бліскучымі іменьнямі“, яны цяпер дасталі горкае перасьведчаньне, што масы ня можна вясьці ўсюды, куды толькі захочацца розным „слупом“, што масы маюць свой шлях барацьбы, з якога іх ня ўдасца зьвясьці. Цяпер гэтыя „слупы“, збанкрутаваныя і разьбітыя, перажыўшыя сваю славу, хіба стануць з дзеячоў—простымі службістамі на выбранай дарожцы. Няхай сабе.

Але перад беларускімі сялянска-работніцкімі гушчамі зноў стаяць свае неадкладныя задачы. Нашы газэты стараліся ўказваць на гэтыя задачы — і будуць гэта рабіць далей.

У сучасны мамэнт адной з сьпешных спраў (поруч з іншымі) зьяўляецца *барацьба за родную школу*. Мы хочам напомніць нашым чытачом, што 1 *студзеня канчаецца тэрмін падачы дэкларацыяў на наступны школьны год*.

Барацьба за родную школу ідзе не ад учарашняга дня. На гэтым шляху беларускія сяляне і работнікі праявілі надзвычайную энэргію, сілу волі, вытрываласьць. Але ўсё гэта пакуль аказалася амаль што марным, бо тыя вываеваныя некалькі школ — ні ў якім выпадку не задаваляюць нашых жаданьняў. *Мы мусім дабіцца роднай школы ў кожнай беларускай вёсцы*! Гэта наша права, гэта наш абавязак, гэта адзін з магутнейшых спосабаў далейшай барацьбы.

Тыя няўдачы, якія мы атрымалі на гэтым шляху барацьбы за школу, тыя аграмадныя высілкі і стойкасьць, якія пашлі пакуль амаль на марна—не павінны нас задзержваць. Проста мусім перамагчы саміх сябе, сваю стомленасьць, магчымае разачараваньне ад няўдачаў. *Мы павінны дабіцца сваей школы ўва што-б то ні стала*! Ня маем права адмаўляцца ад тых здабычаў, якія ўжо заваёваны і ўведзены ў законы, мы павінны гэтым законам надаць жыцьцё, мусім дабіцца, каб яны ня былі простым завалачкам паперы. Цяжасьць барацьбы ўжо на аснове напісаных законаў нікол[і] не павінен прыводзіць нас да думкі аб марнасьці высілкаў на гэтым шляху наагул, наадварот — такая думка надзвычайна шкадлівая, яна можа прывясьці да поўнага зьняверанья ў свае сілы.

Ня гэта павінна выклікаць цяжасьць барацьбы! Яна павінна выклікаць яшчэ большую загартаванасьць, яшчэ большую споенасьць, яшчэ большую сьвядомасьць, што *нічога ў барацьбе дарма не даецца* і ніхто нам нічога ня дасьць, калі мы ня будзем яшчэ галасьней гаварыць аб сабе. *Ня трэба спадзявацца ні на кога, трэба мець крэпкія нэрвы і выдзержку да канца.*

Трэба выкарыстаць гэты ме вялікі кавалак часу, каб яшчэ дружней, яшчэ шчыльней падаць чым найбольш дэкларацыяў. Няхай той, хоць невялікі лік школаў, якія мы ўсё-ж вываевалі, няхай ён дадасьць сілы і сьведамасьці, што *ня ўсе нашы высілкі прападаюць марна*, хоць што небудзь ужо мы маем, а *як будзем бароцца, дастанем усё.*

Некаторыя вёскі падавалі па тры разы — мала гэтага. Будзем падаваць зноў! Будзем падаваць дзесяць разоў, але ўрэшце даб'ёмся, чаго трэба. Уся гісторыя людзтва напоўнена падобнай барацьбой. Усё, што мы бачым у грамадзкім жыцьці — ёсьць вынік барацьбы пасобных групаў грамадзянства між сабой. Хто слабейшы ў барацьбе—падае і зусім адпадае. Перамагаюць сільныя.

Будзем сільнымі! *Будзем вытрывалымі, будзем стойкімі*!

Мы мусім перамагчы!

„*Да канца, браты, будзем цьвёрдымі*“!

Гульня ў апазіцыю.

Гэнэральная атака для расколу П. П. С. закончылася. Рэзультат у ліку 6—8 адарваных ад П. П. С. паслоў досьць значны, але недастатачны, каб можна была сказаць, што соймавая „лявіца“ раскалолася. Проба ліквідаваць расколам, так зв. апазіцыю не ўдалася. Кангрэс ў Саснавіцах прыняў рэзалюцыю, у якой гаворыцца, што П. П. С. далей будзе ў „апазіцыі“ да ўраду. Тое самое зрабілі „Вызваленьне“ і „Стр. Хл.“. Такім чынам можа атрымацца ўражаньне, што ў Сойме ёсьць моцная апазіцыя. У запраўднасьці толькі наіўным і несьвядомым людзям можа здавацца, што П. П. С., „Вызваленьне“ і буржуазныя нац. меншасьці маюць штось супольнага з тым, што завецца апазіцыяй. Тое, што не ўдалося раскалоць П. П. С. — гэта толькі доказ таго, што гандаль аб цане, за якую П. П. С. павінна прылучыцца да стварэньня ўрадовай большасьці, прыняў больш трываючы характар, чым гэта здавалася раней. Тут адбываецца ўзаемная барацьба, якая палягае вось на чым: Павадыры П. П. С. вельмі жадаюць супрацоўнічаць з урадам, але трэба ўзяць пад увагу што гэта гешэфтмахеры, якія галоўна клапоцяцца аб аплаце ў форме пасадаў, міністарскіх партфэляў і інш.

На пэпээсаўскім кангрэсе ў Саснавіцах—Недзялкоўскі адкрыта заявіў, што прынцыпова П. П. С. нічога ня мае супроць супрацоўніцтва з буржуазіяй. На гэтым самым кангрэсе чуліся стогны і плачы пэпэс. павадыраў, якія скардзіліся, што ўвесь час яны шукалі паразуменьня з урадам, але апошні ня выказаў найменшага жаданьня пайсьці ім на спатканьне. Іх дамаганьні-ж такія скромныя. Адзін ці два мініст. партфэлі і П. П. С. з целам і душой перайшла бы на бок „санацыі“.

П. П. С. чагось трэбавала за скончэньне гульні ў апазіцыю, але „Bebe“ нічога не хацела даць. Павадыры „Bebe“ таго погляду, што П. П. С. павіна падтрымаць урад толькі дзеля „любві да бацькаўшчыны“. Але дзеля таго, што павадыры П. П. С. і „Вызваленьня“, апрача любві да бацькаўшчыны, чуюць яшчэ гарачую заботлівасьць да жырных пасадаў і мініст. партфэляў, то з гэтага нічога ня выйшла. Тады „санацыя“, бачучы, што з П. П. С. і Вызваленьнем, як з цэлым, нічога ня ўдаецца зрабіць, пачала прабаваць перацягнуць на свой бок кожнага з іх асобна, што было-б шмат выгадней. Але гэта санатарам не ўдалося.

П. П. С. і „Вызваленьне“ разумеюць, што, як цэлыя партыі, яны змогуць супрацоўнічаць з урадам на лепшых варунках, чым тады, калі яны раздробяцца — бо тады яны губляюць усе шансы атрымаць пару мініст. партфэляў.

Апазіцыйнасьць „левых“ гэта хітра вырахаваны манэвр. Гэта палітычны гандэль найгоршага гатунку, а шкоднасьць яго зьмяшчаецца ў тым, што ў працуючых масаў ствараецца ілюзія, што маюць да чыненьня з апазіцыяй.

Гэтая гульня дае магчымасьць старым, пасівеўшым у парляманцкіх закулісных інтрыгах „левым“ павадырам прыймаць позу бескампрамісовых дэмакратаў і абаронцаў народных інтарэсаў. Як бы мы не адносіліся да таго, што „санацыйная“ прэса піша аб „левых“, мусім прызнаць, што ў адным пункце яна гаворыць праўду, калі кажа, што тыя „абаронцы“, якія лёкайскі служылі ўсім эндэцкім урадам, быўшым у Польшчы, у свой час палец аб палец ня стукнулі, каб правясьці аграрную рэформу — (праўда і санацыя аб гэтым ня рупіцца. Рэд.) цяпер нібы то бароняць інтарэсы сялян і работнікаў. Гэта запраўды абсурд. І яшчэ ў адным пункце „санатары“ правы: гэта тады, калі пішуць, што апазіцыйнасьць „левых“ (П. П. С. і Вызв.) ня шчырая і што галоўная мэта манэўраў іхніх павадыроў гэта ўтрымаць за ўсялякую цану свае катастрафічна аслабяваючыя ўплывы сярод працуючых масаў.

Для гэтай мэты яны ладзяць палітычныя маскарады і выступленьні, як напр. урачысты абход, так зв., Люблінскага людовага ўраду. На гэтым абходзе пэпээсаўцы і вызвалеўцы прыйшлі з лёзунгамі, якімі імкнуцца зрабіць уражаньне, што яны, хто ведае якія, апазіцыянеры.

Але найцікаўшае гэта тое, што ў гэтых люблінскіх урачыстасьцях найгалоўнейшую ролю граў той самы Marjan Malinowski, аб якім ужо даўна сцьверджана, што ён пры эндэцкіх урадах служыў у палітычнай паліцыі. І вось гэты „народны павадыр“ нібы-то бароніць народныя інтарэсы.

Рознымі такімі маніфэстацыямі ў апазіцыйным позах „левыя“ хочуць утрымаць свая палітычныя ўплывы. Але работн. масы Польшчы ўжо дастатачна пераканаліся і ведаюць, як ацаніць гэтую гульню ў апазіцыю. Яны ведаюць, што гэта ўсе вырахавана на вонкавы эфэкт, а ў запраўднасьці П. П. С. і „Вызваленьне“ засталіся тым, чым былі заўсёды—палітычнымі інтрыганамі і кар'ерыстымі, якія яўна спэкулююць на несьвядомасьці і лёгкавернасьці працоўных.

У справе беларускага тэатру у Вільні.

Як усім ведама, Таварыства Беларускае Школы робіць аграмадную працу на вёсцы, галоўна, узбуджаньнем самадзейнасьці масаў на полі тэатру. Спэктаклі на вёсках сталіся звычайным зьявішчам дня, выклікаўшы да творчага духовага жыцьця шмат здольных сілаў з народных гушчаў, якія, дастаючы самі задаваленьне ў сваей працы, разам з тым нясуць промень сьвятла і сваім сябрам па долі. Маем шмат вестак, што частагуста проста няпісьменныя вясковыя хлапцы і дзяўчаты завучваюць свае ролі з слоў суфлёра і, дзякуючы прыродным здолнасьцям, выпаўняюць іх з пэўным пасьпехам. Беларускія сяляне знаходзяць, што справа беларускіх спэктакляў, справа пашырэньня сьветапагляду пры дапамозе тэатру—ёсьць справа іх саміх.

Трэба прывітаць таксама імкненьні віленскіх работнікаў на Новым Сьвеце, якія таксама самі бяз ніякай дапамогі збоку „саматугам“ імкнуцца стварыць свой беларускі работніцкі тэатр і іх пробы ў гэтым кірунку знаходзілі пэўны водгалас сярод саміх работнікаў, якія ў пераважаючым ліку запаўнялі салю падчас спэктакляў работніцкай новасьвецкай трупы.

Але для Вільні патрэбны сталы беларускі тэатр, і то як для работнікаў, гэтак і для інтэлігенцыі. Ужо Вільня мае вялікі кадр беларускай інтэлігенцыі, якая патрабуе беларускіх спэктакляў, як таксама беларускіх лекцыяў—і г. д. Што гэта так, паказвае хоць-бы той факт, што на распачатыя лекцыі Беларускага Студэнцкага Саюзу зьбіраецца да 400 асобаў, — якія пэўна прыходзяць таму, што знаходзяць у сваей абстаноўцы найлепшы адпачынак. Спэктаклі беларускія, кім-бы яны ня ставіліся, таксама прыцягаюць шмат публікі.

Гэтае зьявішча мусіць паставіць на парадку дня справу стварэньня ў Вільні сталага беларускага тэатру, які мог-бы абслужыць як беларускую інтэлігенцыю, гэтак, у большай яшчэ меры, беларускія работніцкія гушчы Вільні, якія такім чынам маглі-б пабачыць тэатральную штуку ў лепшым выкананьні.

Ня глядзячы на высілкі паасобных тэатральных працоўнікоў, справа з'арганізаваньня сталага беларускага тэатру ў Вільні ўсё яшчэ стаіць на мёртвым пункце. Між тым у часе стаўляньня спэктакляў паасобнымі аматарскімі трупамі выявіліся не абы - якія артыстычныя здольнасьці і навет выпрацаваліся пэўныя тэатральныя сілы, як мужчынскія, гэтак і жаноцкія. Часам выкананьне роляў паасобнымі артыстамі проста захапляе публіку, ставячы артыстаў на роўню прафэсіяналаў і прыцягваючы да тэатру публіку ня толькі з чуцьця патрыятычнай неабходнасьці. Да такіх сілаў можам сьмела залічыць з мужчынскіх — гр. гр. Лобана, Чайкова, і ў пэўным стопні—Амельляновіча, Хвораста, Маскаліка і інш., а з жаночых—гр. С. Туркевічанку, як у пэўнай меры—гр. Э. Залкінд, Більдзюкевічыху і інш. Ня кажам ужо аб тым, што ў нас, чамусьці „ў рэзэрве“ знаходзяцца вядомыя тэатральныя іменьні.

Пара нашым артыстам падумаць аб стварэньні сталай тэатральнай дружыны. Патрэбна самадзейнасьць, патрэбна большая захопленасьць да працы, больш веры ў свае сілы, якія маюцца вочавідкі. Сталая тэатральная дружына, сьвядомая сваіх мэтаў, здолее папхнуць справу тэатру, здолее зацікавіць тэатрам, як інтэлігенцкія, гэтак, галоўна, і работніцкія гушчы, якія прагнуць сьвету і могуць гэты сьвет дастаць.

Перад тэатральнай дружынай стала-б, поруч з заданьнем стварэньня сталага тэатру, таксама і заданьне пашырэньня беларускага рэпэртуару шляхам перакладу тэатральных твораў з чужых моваў, суадказваючых нашым абставінам і жыцьцю. Думаем, што навет самае жаданьне мець больш публікі падказала-б выбіраць творы, якія будуць лепш прыйманы работніцкімі гушчамі, як і працоўнай інтэлігенцыяй, якія ў агулу складаюць галоўны колектыў слухачоў.

Справа тэатру насьпела. Патрэбна праца. Спадзяёмся, што нашы артысты самі возьмуцца за гэту працу і што справа стварэньня сталага беларускага тэатру ў Вільні нарэшце дойдзе да патрэбных вынікаў.

Няхай Вільня не астаецца за вёскай.

Украінская прэса аб адчыненьні Беларускай Акадэміі Навук.

Выясьненьне значэньня факту адчыненьня Беларускай Акадэміі Навук з нашага пункту гледжаньня — не дайшло да масаў. Тым часам у-ва ўсей беларускай і ўкраінскай навет прэсе гэты факт знайшоў шырокі водгук.

Каб даць нашым чытачом магчымасьць азнаёміцца з выясьненьнем гэтага факту, хоць ня з нашага пункту гледжаньня, а з пункту гледжаньня хаця-ж прадстаўнікоў украінскае нацыянальнае думкі, зьмяшчаем надрукаваны ў № 106 (333) укр. газэты „Рада" ніжэйшы артыкул, дзякуючы адначасна газэту за такое прыхільнае адношаньне. Падаём у даслоўным перакладзе:

„Культурнае сьвята Беларускага Народу.

Пастановай ураду Беларускай Сацыялістычнай Радавай Рэспублікі з 13-га кастр. сёл. г. пераарганізавана Інстытут Беларускай Культуры ў Менску, які існуе ад 1922 г. на Беларускую Акадэмію Навук.

Адчыненьне Беларускай Акадэміі Навук зьяўляецца надзвычайнай падзеяй у жыцьці беларускага народу. Значэньне гэтага факту падвойнае: культурнае і палітычнае.

Навукова-дасьледчыя ўстановы, а такой зьяўляецца Беларуская Акадэмія Навук, падобна, як Усеукраінская Акадэмія Навук у Кіеве, зьяўляюцца кузьнямі навуковай прадукцыі краю. Гэтыя ўстановы, якія аб'ёднваюць навуковыя сілы народу з тэй мэтай, каб сыстэматызаваць навукова-дасьледчую працу краю, даваць навуковым работнікам крыніцы працы і адначасна быць пасярэднікам у навязаньні кантакту з чужаземнымі вучонымі. Такім чынам, дзякуючы навукова-дасьледчым установам, ня толькі памножваецца, але і паглыбляецца навуковая праца краю.

Ня меншае значэньне мае Беларуская Акадэмія Навук і пад поглядам палітычным. Адчыненьне цэнтральнай беларускай навукова-дасьледчай установы зьяўляецца пасьведчаньнем культурнай сьпеласьці беларускага народу. Сьвядомасьць гэтай сьпеласьці мае першараднае палітычнае значэньне для народу. Яна родзіць пэўнасьць да ўласных сілаў, выклікае творчы захоп і пад'ём паміж якнайшырэйшых масаў народу і стварае гэткім чынам (рука ў руку з спрыяючымі вонкавымі абставінамі) кульмінацыйны пункт для шырокага і поўнага разьвіцьця нацыі.

Сьвядомасьць нацыянальнай вартасьці для беларускага народу патрэбна перш за ўсё.

Беларускі народ, які да часу рэвалюцыі пасьпеў толькі паставіць першыя шагі нацыянальна-культурнага адраджэньня, апыніўся ў пачатку рэвалюцыі, а таксама ў пачатку арганізацыі Беларускай Сацыялістычнай Радавай Рэспублікі (1. I. 1919) перад вялікімі абшарамі незагаранага поля.

Магутнае разьвіцьцё беларускага жыцьця за дзесяць гадоў дзяржаўнага існаваньня Беларускай Рэспублікі сьведчыць, што беларускі народ мае досыць творчых сілаў, каб выкарыстаць у-ва ўсей шырыні нацыянальную і сацыяльную волю. Для з'ілюстраваньня гэтага даволі параўняць беларускую школьную справу перад рэвалюцыяй і пасьля рэвалюцыі. Да рэвалюцыі ня было амаль беларускага школьніцтва (першую беларускую пачатковую школу заложана ў 1915 г. у Вільні—у часе, калі заходвія беларускія землі апынуліся пад нямецкай акупацыяй), цяпер на Беларусі ёсьць два ўнівэрсытэты, 32 гімназіі, 30 прафэсіянальных (завадовых) школаў і пачатковыя беларускія школы па ўсім краі.

Не зважаючы на гэты творчы пад'ём беларускага насельніцтва, перад беларускім народам стаіць яшчэ шмат нявыкарыстаных магчымасьцяў развіцьця нацыянальнай сілы. У такіх абставінах адчыненьне Беларускай Акадэміі Навук ня можа прайсьці бяз упліву. Яно стане новай падбадзёрваючай сілай у працэсе развіцьця жыцьця беларускай рэспублікі.

Палітычнае значэньне адчыненьня Беларускай Акадэміі Навук не абмяжуецца толькі ў адносінах да самай Беларускай Сац. Рад. Рэспублікі. Радасьць і пасьвет беларускага насельніцтва ў умовах радавай ўлады адабёцца шырокім рэхам і сярод заходняга беларускага насельніцтва. Яны дадуць маральную сілу заходнім беларусам перетрываць цяжкія часы, а таксама выкоўваюць у іх нацыянальную адпорнасьць проціў усіх ударам часу.

Адчыненьне Беларускай Акадэміі Навук набірае тым большага значэньня, што за дзесяць гадоў ніводнай навуковай працы не ладзілі Рэспублікі выбудавана трывалых навуковых падмуркоў пад існаваньне гэтай інстытуцыі. Завязаўшы Беларускай Акадэміі Навук зьяўляецца Інстытут Беларускай Культуры. За чатыры гады свайго існаваньня Інстытут шырока і глыбока разгарнуў навукова-дасьледчую працу ў галіне вывучэньня прыроды, гаспадарскага жыцьця, гісторыі і мовы Беларусі, згуртаваў наўкола сябе каля 300 вучоных і культурных работнікаў, наладзіў сталую навуковую сувязь з 55-цю навуковымі ўстановамі у Радавых Рэспубліках і з 20-цю чужаземнымі навуковымі таварыствамі, выдаў 72 навуковых твораў і г. д. Гэткім чынам Інстытут Беларускай Культуры граў ужо здаўна на Беларусі ролю Акадэміі Навук, і рэарганізацыя Інстытуту на Акадэмію зьяўляецца толькі стварэньнем новай, больш шырэйшай формы для якнайінтэнсыўнейшага выяўленьня існуючай беларускай навуковай сілы.

Украінскі народ, які разам з беларускім народам у працягу доўгіх стагодзьдзяў геройска змагаўся з вынішчаючым наступам чужацкай за сваё нацыянальнае і сацыяльнае вызваленьне, шчыра прывітаў кузьню беларускіх навуковых вартасьцяў, якой зьяўляецца новаарганізаваная Беларуская Акадэмія Навук. Доказам гэтага зьяўляецца водгук, які знайшоў факт адчыненьня Беларускай Акадэміі Навук у украінскай прэсе і украінскіх навуковых колах. Апрача таго, варта надкрэсьліць голас віцэ-прэзыдэнта Усеўкраінскай Акадэміі Навук К. Воблага, які ў гутарцы з супрацоўнікамі прэсы сказаў: „Украінская Акадэмія Навук, як старшая сястра Беларускай Акадэміі, усялякі будзе дапамагаць маладой Беларускай Акадэміі ў яе працы. Мы з усіх сілаў падтрымліваем нашую братнюю Белар. Акадэмію Навук".

У часе рэвалюцыі 1905 г. было ў Пецярбурзе актыўнае беларускае выдавецтва для народу пад назовам: „Загляне сонца і ў наша ваконца". Гэта назва зьдзейсьніваецца на нашых вачох. Арганізацыя Беларускай Акадэміі Навук зьяўляецца адным з найясьнейшых праменьняў творчай, сонечнай пары беларускага народу".

З украінск. пераклаў Я. М.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Гандаль Радавых Рэспублікаў з Польшчай.

У верасьні г. г. прывезена з Радавых Рэспублікаў у Польшчу 1580 вагонаў розных тавараў, у тым ліку 1214 вагонаў жалезнай руды.

За гэты самы час у Радавыя Рэспублікі прывезена з Польшчы 492 вагораў розных тавараў, з якіх 327 жалеза і station бляхі.

Пагроза даражыні.

Міністар Скарбу прыгатаваў праект 50 проц. падвышкі дамовых падаткаў у гарадох.

Разумецца, што ў зьвязку з гэтым падаражэюць і іншыя галіны жыцьця.

Новы радавы гандлёвы прадстаўнік у Варшаве.

Радавы ўрад адклікае ў Маскву свайго гандлёвага прадстаўніка ў Польшчы Лізарава, на якога ў Варшаве быў зроблены замах расейскім эмігрантам Война Войцехоўскім. На месца Лізарава з 1-га сьнежня с. г. будзе назначаны Шаўцоў.

Новы нямецкі пасол у Варшаве.

Польская прэса падае, што цяперашні нямецкі пасол у Варшаве Раўпэр атклікаецца назад у Нямеччыну. На яго месца назначаецца д-р Гэрмэс, б. старшыня нямецкай дэлегацыі для вядзеньня гандлёвых перагавораў з Польшчай; гэта той самы, на якога нядаўна нападала польская прэса, вінавацячы яго за сарваньне гэтых гандлёвых перагавораў.

Неяк ды паразумеліся...

14-га лістапада паразумеліся тры большыя ўгадовыя польскія партыі: ППС, Вызваленьне і „Строньніцтво Хлопске".

Паразуменьне мае на мэце: „супрацоўніцтва гэтых партыяў ува ўсіх справах, датычачых абароны і ўмацаваньня рэспубліканскага ладу, дэмакратыі, парлямантарызму і вольнасьці (чыей? — Рэд.) у межах правамоцнасьці і дзейнасьці Сойму і Сэнату".

Гэтая новастварыўшаяся партыя „абаронцаў" працоўнага народу налічвае аж 122 паслоў, але гэта хіба ня значыць, што працоўныя масы Польшчы не пазнаюць сваіх здраднікаў і ў „новай скуры".

Нешта аказаліся.

Заціхшае ад самых выбараў, добра ведамае нашаму сялянству „Вызваленьне", насылаўшае нам (у падзяку за галасы нясьведамага беларускага сялянства) сваіх асаднікаў, пасьля доўгага „зімовага сна" (летам!) нешта ізноў аказалася. Што за прычына гэтага „а ку-ку!" вядомай польскай сацыял згоды—дакладна ня ведама — або яны бачаць, што галасаваўшыя на іх у гэтыя выбары сялянска-работніцкія масы Польшчы адварочваюцца ад іх так, як ад іх адвярнулася ўсё беларускае грамадзянства, і яны сваім „кукаваньнем" хочуць утрымаць іх пры сабе хоць яшчэ з мінютку, як малое даіця, ці мо' гэта ўжо апошняе перадсьмертнае „бывай", як і кожнага нармальна ўміраючага жывога арганізму. Хутчэй усяго, што тут ёсьць апошняе — нармальная сьмерць — з аднаго боку дзеля таго, што працоўным масам ужо абрыдла іх „гульня", і яны, як мага, гоняць ад сябе сацыял-здраду, а з другога боку дзеля таго, што і пануючая цяпер буржуазія не сьпіць — яна ўсімі сіламі стараецца разьбіваць, працягіваць да сябе такія сацыял-згодніцкія партыі.

Вось гэтае натуральнае пачуцьце сьмерці розных гнілых (здэмаралізаваных) „сацыялістычных" партыяў і застаўляе іх адсоўваць гэтую сьмерць з таго ці іншага боку хоць на мінютку. Дзеля гэтага яны і робяць розныя кангрэсы, як ППС, на якіх „аднагалосна" (разумеецца!) сцьвярджаецца, што партыя астаецца па-старому моцнай і па-старому „адзінай і недзелімай" і... апазіцыйнай да буржуазнага ўраду.

Дык пагледзім, як сацыял-угода выражае такую апазіцыю, шаблон якой дае нам цэлы рад рэзалюцыяў „Вызваленьня", ухваленых ім на надовяшнім зьезьдзе ў Любліне: „Зьезды дэлегатаў Вызваленьня" з гораччу і сумам сцьвярджае, што жыцьцё адышло за 10 гадоў ад даўнейшай (а як ад цяперашняй? Рэд.) праграмы „Вызваленьня". („Rządu Lubelskiego"). Найбольш балючым зьяўляецца тое, што фактычным уладарам і кіраўніком польскай палітыкі ёсьць м. Пілсудскі"...

„Лічучы цяперашні ўрад і яго сыстэму ўрадаваньня за чужыя народу і яго слушным жаданьням, Зьезд пастанаўляе вясьці барацьбу за... направу Канстытуцыі, праваўладнасьць (а дзе-ж даўнейшае „палепшаньне" долі працоўных? Рэд.).

Запраўды сьмешнае выражэньне апазіцыйнасьці!...

Зьмена ў польскім судаўніцтве.

Польская прэса паведамляе аб маючых быць „грунтоўных" зьменах у новым польскім карным кадэксе, які выйдзе ў жыцьцё ў будучым годзе. Як прыклад „грунтоўных" зьменаў, прэса надае, што будзе ўведзены аднолькавы тэкст прысягі для сьведкаў усіх рэлігіяў; чытаньне прысуду будуць слухаць стоячы і судзьдзі і яшчэ іншыя зьмены судовых цэрэмоніяў.

Апрача гэтага, падаюцца яшчэ наступныя зьмены: прымусовы адвакат у судовых справах глухіх і нямых і дазвол адвакатам браць учасьце ў сьледзтвах, а так-жа права падаваць жалабы проці праведзенага сьледзтва.

З друкарскай забастоўкі.

12 г. м. у некаторых варшаўскіх друкарнях выбухла забастоўка друкарскіх работнікаў. Прычына — ня выпаўненьне гаспадарамі гэтых друкарняў новападпісанай імі ўмовы з работніцкім прафсаюзам.

У аднэй з бастуючых друкарняў здарыўся клясычны прыклад магчымасьці нейкай вымаранай панамі „надклясавай" справядлівасьці. Справа ў тым, што друкарня Сакерскага найменш аплачвае сваіх работнікаў — бо плаціць толькі ад 30 да 50 злотых у тыдзень; то выкваліфікаваным работнікам, у той час, як падпісаная ўмова абавязвае найніжэйшую плату 80 зл. у тыдзень.

Калі да Сакерскага зьвярнуўся ў гэтай справе работніцкі дэлегат, дык пан „хлебадаўца" звольніў яго без абавязваючага папярэджаньня і сказаў, што не прызнаё і ня прызнае ніякай умовы і прафсаюзу.

Апрача гэтага, „міласэрдны хлебадаўца" ня хоча выплаціць бастуючым за залеглы адпрацаваны час.

Голас паляка аб школьнай справе у Польшчы.

Грам. Кароль Крулікоўскі (Karol Królikowski) падаў у варшаўскай часопісі „Polska Wolność" № 46 за 28. X. 1928 г. цікавы артыкул аб пачатковым школьніцтве Польшчы. Перадрукоўваем гэты артыкул да ведама нашых чытачоў.

— „Вось-жа ў мінулым школьным годзе (1927-8),—піша грам. Крулікоўскі, — не хадзіла ў-ва ўсім краі да школы, ня гледзячы на прымусовае права, 626.400 дзяцей, а ў бягучым школьным годзе ня будзе хадзіць, калі лік настаўнікаў і школьных саляў не павялічыцца (гэтак будзе 664.925 дзяцей. Цікавым зьяўляецца гэткі сказ міністра Дабруцкага 7 траўня бяг. году ў Сойме: „Найбольшы клопат маем з недахопам настаўніцкіх сілаў, бо гэтыя сілы ўвесь час адплываюць у нас да гаспадарчага жыцьця. Дык будзем прасіць законадаўчыя органы, каб далі гэтаму раду, а тымчасам прапануем падвышку, каб прыняць 73 новых настаўнікаў". Для 664.925 дзяцей 73 настаўнікі. На аднаго настаўніка 9.108 дзяцей, а адносны лік духавенства, утрымліванага-ж дзяржавай, павялічваецца непамерна: ў 1927-8 школ. годзе прыбыло 490 асобаў.

Апошні 1927 гадавік даў найменшы лік дзяцей (гадавік з часаў вайны), а кожны далейшы гадавік, пачаўшы з 1928 году, будзе што раз, то большы лікам, каб у 1939-40 школьным годзе лік дзяцей падрос да 6.071.193. Каб гэтую „колькасьць" дзяцей, якая з кожным годам павялічваецца, можна было вучыць, трэба гвалтам („ім гэта ня сьпешна") павялічваць лік настаўнікаў, паміма будаваньня школьных будынкаў. Згодна з соймаваю справаздачаю, трэба да 1939-40 г. штогоду вучыць сярэдня па 8.000 настаўнікаў. Штогоду прыбывае настаўнікаў агулам 4500, а ўбывае 4000 (даныя з прамовы міністра Дабруцкага за 7 траўня б. г. у Сойме) — застаецца 500 асобаў, — а колькі трэба за год — я ўжо сказаў, а колькі бюджэт прадбачыць на 1928-9 шк. год (73) таксама я пісаў. Да 1940 году лік дзяцей узрасьце да 6.071.193. Хочучы ўсе гэтыя дзеці памясьціць у школах, трэба выбудаваць да 1940 г.—91.365 школьных хатаў і 70.023 настаўніцкія кватэры, на гэта трэба ў сярэднім 411.367.500 злотых. Разлажыўшы гэтую суму на 12 гадоў, атрымаем, што на будову школаў у працягу гэтых гадоў, штогоду трэба плаціць 34.280.625 злотых, — тымчасам Урад Пілсудскага ў бюджэтны прэлімінар на б. г. устаўляе суму 5 мільёнаў (сума гэтая галасамі лявіцы падвышана да 20 мільёнаў).

На школьную гігіену (варункі, якія спрыяюць сухотам) прызначаецца 147.000 зл. для ўсіх школаў на абшары ўсяе Рэспублікі. Адна школьная мапа каштуе 40 зл., а на ўсе навуковыя падмогі прызначаецца ў новым бюджэце для аднае школы 20 злотых. А ніякія іншыя дзейнікі ў дзяржаве (напр. самаўрадовыя) ня маюць абавязку даваць навуковыя падмогі школам.

Я хацеў вышэй прадставіць адношаньне да справаў школьных агулам — як-жа-ж урады Пілсудскага адносяцца ў асобнасьці да настаўніка:

1) Урад Пілсудскага ўняшчасьціў настаўніцтва практычнымі экзаменамі: кожны настаўнік, хочучы застацца на службе, мусіць па двох гадох працы здаваць практычны экзамен (кваліфікацыйны), апрача сэмінарскае матуры, якую ўжо мае. Замест таго, каб зрэфармаваць сыстэму вучэньня настаўнікаў — іх абцяжваюць экзаменамі пасьля сканчаньня Настаўніцкае Сэмінарыі. Расходы на асьвету меншыя. Настаўнік ад перапрацаваньня пры сваім падрыхтоўваньні да экзамену і лекцыяў, захварэе на сухоты. Месца для новае сілы. Урад хіба гэткае палітыкі ня хоча вясьці?

2) Урад Пілсудскага ня верыць настаўніцтву і „асьцерагае настаўніцтва перад лішнім самаангажаваньнем у барацьбе, таму што тады настаўніку грозіць пападзеньне ў ідэйны канфлікт, прынамся з часьцю бацькоў вучняў". Можам проста сказаць, што нельга настаўніку выказваць сваіх палітычных перакананьняў, бо выраз самаангажаваньне — можа быць расьцяжна тлумачаны. „Нарушэньні (выкрочэня),—далей кажа цыркуляр Дабруцкага за 29 жніўня 1927 г.,—у гэтай меры ня могуць цярпецца і павінны пацягнуць для настаўніцтва непажаданыя кансэквэнцыі". А 104 арт. канстытуцыі кажа выразна: „Кожны грамадзянін мае права вольнага выказваньня сваіх думак і перакананьняў, калі гэта не нарушае правілаў права".

3) Найбольшы % настаўнікаў дастае каля 200 зл. пэнсіі ў месяц, якое сумы ледзь хопіць на скромнае ўтрыманьне, на аплату кватэры, закупку апалу. Дзе вопратка, хатнія прылады, утрыманьне чыстаты, расходы на выезды з глухое вёскі па закупку рэчаў першае патрэбы, куплю падручнікаў, неабходных для нас пры вядзеньні навукі і падручнікаў, патрэбных дзеля падрыхтаваньня сябе да вымаганых, пад варункам звальненьня з пасады, экзаменаў? Вымагаецца, каб ня былі ілюмінатары на глухой правінцыі, а ці мы можам сабе пазволіць купіць радыё, якое нас злучала-б з культурнымі цэнтрамі сьвету? Урад часта абяцанак датычна павялічэньня пэнсіяў не датрымлівае. Нарэшце Сойм павялічвае на 15 прац. пэнсіі, тады, калі зарабак настаўніка ў Нямеччыне—400 злотых, у Чэхіі—350 зл. Мы плацім у месяц за кватэру ад 15 да 40 зл., а дадатак на гэтую мэту раўняецца 5.55 зл. Урад цьвердзіць, што няма пакрыцьця на павялічэньне заробку — тым часам ніхто не шафаваў фразаю „пакрыцьце", калі ішло аб тое, каб даць падвышку ахфіцэрам у 1926 г. і нічога не гаварылася аб „пакрыцьці", калі ішло аб прызнаньне $22^1/_2$%-нага дадатку, таму, што добра маецца, кліру ў чэрвені месяцы б. г.

Жанатыя настаўнікі, апрача турботаў, што выцякаюць з малога вынагароджэньня, маюць яшчэ „цьвёрды гарэх" з вучэньнем сваіх найдаражэйшых дзяцей. Бо яны змушаныя часам сына ці дачку сваю пасылаць да прыватнай школы, дзе за вучэньне плаціцца да 76 зл. у месяц, зварот „належнасьці" на гэтую рэч раўняецца 30 зл. месячна.

Несправядлівае аплачваньне зьяўляецца санкцыянаваным ізноў цыркулярам м-ра Дабруцкага за 20 лістап. 1927 г., на аснове якога настаўнік абмяжованы ў даваньні прыватных лекцыяў. Ізноў гэткі зварот распараджэньня: „Трэба адмаўляць у пазваленьні поўніць абавязкі платнага ўрадніка ў якой-небудзь прыватнай інстытуцыі, або самаўрадовай, а асабліва бурмістра, войта, або камісара места, сябра дырэкцыі і фінансавае інстытуцыі, банковае, саюзаў, каапэратываў і да г. п." — гэта-ж цалком абмяжоўвае настаўніка ў грамадзкіх правох, а затым трудна яго пагадзіць з ніякаю пэнсіяю.

Прадстаўляю ад'емныя свойствы, бо-ж няма палепшаньня. Былі людзі, якія імкнуліся да прынцыповых зьменаў у школьнай палітыцы, але яны зараз былі адсунуты (віцэм. Гайчак).

Наастатак увага аб палітыцы ў часе выбараў у Сойм і Сэнат: каб запэўніць урадоваму сьпіску (адзінцы) перамогу, адрывалі ад працы настаўнікаў і іншых урадніпаў на праця 2 месяцаў, каб гэтыя настаўнікі агітавалі на карысьць ураду. І гэта рабілася ўжо пасьля выданьня цыркуляру Дабруцкага і падчас пераводу „за кару" іншых настаўнікаў, дзейных у палітычным жыцьці, а перакананьняў „неадзінковых".

Чаго павінен мудры грамадзянін дамагацца і да чаго павінен імкнуцца на найбліжэйшую мэту, калі йдзе аб школьныя справы:

1) У зьвязку з зьменаю Канстытуцыі, аб чым будзе гаварыцца на васеньняй сэсіі Сойму б. г., дамагацца трэба скасаваньня 114 арт. Канстытуцыі, а знача: Адлучэньня

Рэха львоўскіх падзеяў.

Прэса інфармуе, што ў сувязі з галосньмі львоўскімі падзеямі Гарадзкі Стараста ў Львове Рэйнлендэр перанесены ў „стан спачынку“ („адстаўка“ — зволены). Камандант львоўскай дзярж. паліцыі мае быць пераведзены ў Беласток, а на яго мейсца пойдзе камандант Віленскае дзяржаўнае паліцыі. Мейсца-ж Гарадз. Старасты ў Львове займе капт. Клётц, урадовец Міністэрст. Вайсковых Спраў. Прадбачацца так-жа зьмены і ў львоўскай сьледчай паліцыі.

Аднак, як піша № 88 украінск. клерыкальнай „Новай Зоры“ — „арышты маладых хлопцаў і дзяўчат у Львове трываюць далей.

Заграніцай.

Фінансавы экспэрт Польшчы едзе ў ССРР.

Польскія газэты падаюць, што амэрыканскі фінансавы экспэрт пры польскім урадзе Дэвіс выехаў у Маскву.

Перад ад'ездам ён адведаў радавага пасла ў Варшаве Богамолава, з якім меў доўгую нараду. З якой мэтай едзе Дэвіс у ССРР, газэты не падаюць.

Міжнародная жалезнадарожная канфэрэнцыя.

15-га лістапада с. г. пачалася ў Празе міжнародная жалезнадарожная канфэрэнцыя, на якой будуць разглядацца справы беспасярэдняй камунікацыі паміж Эўропай і Азіяй праз Радавыя Рэспублікі.

На гэтай канфэрэнцыі і будзе апрацаваны і ўхвалены расклад руху цягнікоў паміж галаўнейшымі станцыямі Эўропы і Азіі, а таксама на лініях: Варшава—Ленінград; Варшава—Масква; Львоў—Кіеў і Адэса.

Францыя будуе ваенныя караблі.

Францускі ўрад, які хоча зацерці вочы ўсяму сьвету сваей быццам „мірнай палітыкай“, падпісваючы вядомы процівенны „пакт Келёга“, пацiху будуе ваенныя караблі. Мала Францыі сваіх, а таксама чужых караблёў, якія заграбла ад пераможанай Нямеччыны, пачала будаваць цяпер новыя. Нямецкія газэты падаюць, што Францыя прыступіла да будовы 27-х вялікіх ваенных караблёў. Вось табе і ўрачыстыя дагаворы, вось табе і буржуазная праўда!..

Канец міністэрскага крызісу ў Францыі.

Разьбежнасьці паміж некаторымі міністрамі францускага ўраду давялі ўрад Пуанкарэ да дымісіі. Сталася гэта таму, што міністар унутр. справаў падаў у бюджэце вялізарныя сумы на ўтрыманьне францускіх каталіцкіх місіяў у калёніях. Процій гэтага востра выступілі міністры-сацыялісты. Кан[illegible] ніяк не ўдалося злагодзіць, так што ўрад змушаны быў падацца да дымісіі.

Ужо некалькі дзён ідуць перагаворы паміж правадырамі галоўных францускіх партыяў, але вынікаў гэтых перагавораў яшчэ няма. Газэты дапускаюць, што прэзыдэнт зноў даручыць стварыць кабінэт Пуанкарэ. Як падаюць апошнія весткі, апазіцыя процій Пуанкарэ вельмі сільная, дзеля чаго ён адмаўляецца прыняць на сябе місію тварэньня новага кабінэту міністраў, аднак, нарэшце згадзіўся стварыць кабінэт, у які большая палова міністраў увайшло новых.

У Румыніі ўтварыўся новы кабінэт.

Як падае польск. тэлегр. аген., у Румыніі ўтварыўся новы кабінэт міністраў на чале з Маню — правадыром румынскай „сялянскай“ партыі. Новы ўрад выпусьціў камунікат, у якім падтрымлівае сучасную канстытуцыю і пануючую дынастыю (караля).

У аднэй з урадавых часопісяў абвешчана распушчэньне парляманту і вызначэньне новых выбараў. Выбары гэтыя адбудуцца ў працягу 30 дзён ад часу распушчэньня парляманту. Пэўна-ж, зноў будуць „румынскія“ выбары!

Варожыя проціпольскія дэманстрацыі ўкраінцаў у Румыніі.

Польскія газэты падаюць, што ў м. Чарнавіцах у часе ўрачыстай акадэміі, уладжанай Польска-Румынскім Таварыствам Прыхільнікаў Польшчы, з прычыны 10-х угодкаў незалежнасьці Польшчы, у часе, калі аркестар граў польскі гымн, некалькі ўкраінцаў стараліся зрабіць замяшаньне, але былі на месцы арыштаваны паліцыяй.

А гадз. 2 уначы ўкраінскія дэманстранты абкідалі каменьнямі будынак польскага консуляту ў Чарнавіцах, пры чым выбілі некалькі шыбаў.

Проціпольскія дэманстрацыі на Радавай Украіне.

З прычыны першалістападавых падзеяў ў Львове, адбыліся ў большых местах і мястэчках Радавай Украіны вялікія проціпольскія дэманстрацыі. Холмская украінская газэта „Нове Життя“ II.XI № 32 падае, што „Саюз украінскіх пісьменьнікаў і Усеукраінская Акадэмія Навук выдалі адозву да ўсіх вучоных усяго сьвету з пратэстам процій праследаваньня ўкраінцаў у Польшчы.

У Маскве будуюць „Мэтрополітэн“.

У хуткім часе ў Маскве пачынае працу акцыянэрнае таварыства для будоўлі ў Маскве „Мэтрополітэну“—(падзямельная жалезная дарога). У працягу бліжэйшых некалькіх гадоў прадбачыцца будоўля трох лініяў падзямельнай дарогі. Кошты гэтай будоўлі абойдуцца ў 55 мільёнаў рублёў.

Гугэнбэрг—старшыня нямецкай народнай партыі

Нядаўна ў нямецкай народнай партыі адбыліся выбары старшыні. Замест умяркаванага Вэстарпа, выбраны Гугэнбэрг—нямецкі „кароль часопісяў“, шчыры прыхільнік павароту б. кайзэра. Абыймаючы ўрад партыі, Гугэнбэрг выдаў адозву, у якой зазначыў, што яго мэтай будзе парваць нявыгадны для Нямеччыны „Вэрсальскі Трактат“ і нарушыць уходзіця граніцы з Польшчай. У адказ на гэта ўсе польскія газэты выпусьцілі сажнёвыя артыкулы, у якіх востра нападаюць на Гугэнбэрга і на сучасную нямецкую палітыку.

Забойца мэксыканскага прэзыдэнта засуджаны на сьмерць.

Нядаўна закончыўся ў Мэксыцы суд над студэнтам Торалям, які летам сёл. году забіў мэксыканскага прэзыдэнта Обрэгона. Як вядома, забойства гэта адбылося, як помста каталіцкага духавенства за абмяжаваньне іх правоў. Суд аднагалосна засудзіў Тораля на сьмерць. Выкананьне прыгавару мае наступіць праз пяць дзён ад часу абвешчаньня прыгавару. Адначасна з ім засуджана і супольніца яго законьніца Концэпцыя на дванаццаць гадоў цяжкага вастрогу.

Страшныя падзеі ў Кітаі.

У правінцыі Анвей пануюць вялікія разбойніцкія банды, якія тэрорызуюць спакойных жыхароў. Яны спалілі места Фуянг, пры чым страты выносяць больш 30 мільёнаў даляраў. Бандыты рэжуць і паляць усё, што толькі пападае ім у рукі. Навет маленькіх дзяцей яны кідаюць жывымі ў вагонь. Падобныя выпадкі адбываюцца таксама і ў Шантунзе. Усе студні перапоўнены трупамі.

Геройства кітайскіх жанчын.

Частыя напады кітайскіх разбойніцкіх бандаў змусілі кітайскіх жанчын з'арганізаваць самаабарону. Як падаюць газэты, у аднэй з правінцыяў Кіангсу некалькі сот жанчын узброіліся, каб пакончыць з тэрорам разбойніцкіх бандаў. У бойцы з бандытамі забіта дзевяць жанчын. Геройства і адвага кітайскіх жанчын змусіла бандытаў да ўцечкі.

Зьвяставаньне.

Кругом ціша,
Не калыша
Вецер кволых дрэў;
Усё прыстала
Замаўчала—
Сьвет, як анямеў!...
„Канец сьвета!...“
Вестка гэта
Неслася, як гром,
І са страху
Ва ўсе махі
Біў званар: „Бом-бом!...“
Ціха людзі—
Нешта будзе:
Гэта вестка—знай!
Так панура
Перад бурай,—
Буры, брат, чакай!
Хутка цішу
Закалыша
Яе грозны сьпеў,
Зломіць многа
Са старога
Яе ўздым—павеў.
Пасьля-ж буры
Зьгінуць хмуры,
Заблішчыць прамень,
Сонца гляне
І настане
Лепшы, новы дзень!

Ліпень 1928 г. Л. П.

Наша хроніка.

Справаздача з надзвычайнага агульнага сходу Белар. Каапэр. Т-ва „Пчала“. Дня 22 кастрычніка ў памешканьні Белар. Каапэр. Банку—Вільня, Віленская вул. № 8—адбыўся агульны сход Т-ва „Пчала“.

Старшыня Наглядной Рады гр. І. Мятла адчыніў Сход і прачытаў парадак дня. Запрасіўшы на старшыню Сходу грам. І. Мятлу, а на сэкратара грам. А. Войціка, сход прыступіў да працы. Прыняўшы да ведама, справаздачу Управы з працы мінулага часу, перайшлі да другога пункту дня: да перавыбараў Наглядное Рады.

У сябры Наглядной Рады ўвайшлі: гр. Дараховіч Сьцяпан, Шнаркевіч Язэп, Пяткевіч Міхал, Біндзюк Ігнат, Манцэвіч Мікалай і Татарын Сэрафім.

Заступнікі: грам. Мятла Ігнат і Жукоўскі Аляксандар.

У справе прыняцьця ўдзелу ў Агульна-Славянскім Зьезьдзе Пчаляроў у 1929 г. у Пазнані пастаноўлена, удзел прыняць, а поўную распрацоўку гэтага пытаньня даручыць Управе.

У справе ўступленьня Т-ва „Пчала“ ў Рэвіз. Саюз, сход пастанавіў даручыць Управе паразумецца з другімі Белар. Каапэратывамі, каб супольнымі сіламі як найхутчэй стварыць свой Саюз.

Далей быў прачытаны апрацаваны Управай плян працы на наступны 1929 г., які Сход аднагалосна пастанавіў прыняць.

У справе крэдытаваньня і вызначэньня сумы крэдытаў Сход пастанавіў дазволіць Наглядной Радзе і Управе зацягіваць крэдыты, не перавышаючыя 5-кротнай сумы паёў і толькі на гандлёвыя апэрацыі.

У канцы выслухалі даклад грам. С. Дараховіча аб патрэбе ладжаньня папулярных лекцыяў на каапэратыўнаму пчалярству.

На гэтым Агульны Сход закончыўся.

Гэтага-ж дня адбылася паседжаньне Наглядное Рады, на якім была выбрана Управа ў асобах: Л. Войцікавай, М. Тулейкі і У. Кур'янкі.

Дзьве чарговыя лекцыі з беларусазнаўства, арганізаваныя Беларускім Студэнцкім Саюзам — для сяброў саюзу і грамадзянства, адбудуцца ў салі Белар. Інст. Гасп. і Культ. (Вострабрамская 8—1) — у нядзелю 25 лістапада. Чытаць будуць запрошаныя Б.С.С. лектары: 1) грам. Ів. Савіцкі—на тэму: „Старадаўняя таргоўля у Полаччыне і яе значэньне“, 2) кс. А. Станкевіч — на тэму: „Нарысы з беларускай этнаграфіі (працяг).

Пачатак пунктуальна ў 4 гадз. папаўдні, уваход вольны.

Абвестка. Беларускі Народны Тэатр пры чынным удзеле сяброў Белар. Студэн. Саюзу арганізуе ў салі Белар. Інст. Гасп. і Культуры (Вострабрамская 8—1) дзьве вечарыны. Першая адбудзецца ў суботу дня 24-га, другая—у нядзелю—дня 25 лістапада.

У праграме: 1) Залёты — камэдыя ў 3-х актах В. Д. Марцінкевіча; 2) Агульныя скокі.

Даход з вечарынаў пайдзе на карысьць Белар. Студ. Саюзу.

Пачатак у 8 гадз. увечары.

Спадар у Варшаўскім Унівэрсытэце. У № 18 у сваім „воргане“ („Народ“) Спадар паведамляе, што: „6-га лістапада д-р Я. Станкевіч прачытаў першую лекцыю беларускае мовы ў Варшаўскім Унівэрсытэце“.

Нешта вельмі мала Спадар сам аб сабе „гукае“... пэўна і там яго спаткалі „інтэрнацыяналістыя“, без якіх Спадар, як без паветра, нідзе відаць не абходзіцца.

Матуральныя правы Віленскай Беларускай Гімназіі. Аб нядаўным атрыманьні Віленскай Беларускай Гімназіяй правоў публічнасьці, той-жа нумар „Спадара“ падае наступную заметку:

„Ня гледзячы на ўсе перашкоды і правакацыі, каторыя рабіла (?) інтэрнацыянальная (?!) група, Беларуская Гімназія ў Вільні нядаўна дастала правы публічнасьці, аб чым віленскі куратар пісьмена наказаў дырэкцыі гімназіі“. Ужо „шчасьлівіў“ Спадар з кумпанамі гімназію ў Радашкавічах, каб толькі не зрабіў гэтага і з Віленскай, бо пачаў прысьвячаць ёй многа ўвагі.

Да шырэйшага агляду справы атрыманьня правоў Віл. Бел. Гімназіяй, вернемся ў наступных нумарох.

Пакіньце сабе пахвалу. Беларускі Студэнскі Саюз, куды ўваходзяць насьлядоўнікі розных беларускіх палітычных кірункаў, у вапошні час, з уваходам новых сілаў, пачаў праяўляць ажыўленьне. Поруч з іншай працай, ён запрасіў розных лектараў для чытаньня лекцыяў па беларусазнаўству. Спачатку для лекцыяў была выбрана нібы нэйтральная саля Гімназіі, але засеўшыя ў Гімназіі „санатары“ не дазволілі карыстацца саляй і студэнты прымушаны былі прасіць салі ў паадзінокіх грамадзкіх інстытуцыях, як—Т-ва Б. Шк., Інстытут Бел. Гасп. і Культуры. Вышла так, што дзякуючы несуадказнасьці будынку Т. Б. Ш. для магчымага ліку большага ліку слухачоў — прадстаўніку сялянска-работніцкай думкі д-ру І. Дварчаніну і адначасна з кс. А. Станкевічам прышлося прачытаць лекцыі ў залі Інстытуту, які з гэтага поваду пабачыў у сваіх сьценах проста нябывалы прыток публікі, ледва зьмешчанай у салі.

І вось „Сялянская Ніва“ ўбачыла ў гэтым „аздараўленьне беларускіх адносінаў“, пішучы аб гэтым у заметцы „Дзьве лекцыі“ і не ўпамінаючы навет, што лекцыі ладзілі студэнты. Па нашай думцы—гэта дэмагогія. „Аздараўленьне беларускіх адносінаў“ зусім ня ў тым, што прадстаўнік сялянска-работніцкай думкі чытаў лекцыю, ня маючы іншай, у салі Інстытуту, а аздараўленьне ў тым, каб паказаць і ў сьценах Інстытуту ўсю няправільнасьць сельсаюзьніцка-хадэцкіх разумаваньняў. Здаровай лічым самую дэфэрэнцыяцыю, аддзяленьне дробна-мяшчанскіх элемэнтаў ад працоўнай думкі, адкрытае выказваньне ўсюды, дзе толькі можна, недарэчнасьці ўгодніцкай ідэалёгіі і шкадлівасьці яе для беларускіх працоўных гушчаў. Ні аб якой „ідыліі згоды“ пэўна-ж ня думаў, як прэлегент — Д-р І. Дварчанін, так і тое грамадзянства, якое прышло на лекцыю.

Прэлегент думаў аб грамадзянстве, а грамадзянства думала аб сваім лектары.

У адным згаджаемся з сельсаюзьніцкім органам, што аздараўленьнем таксама лічым выкіненьне за борт грамадзкага жыцьця прадажніцкіх элемэнтаў.

Пахвалы сабе не патрабуем!

Ці ня зьмена фронту? „Сялянская Ніва“, якая, як ведама, з пачатку свайго існаваньня трубіла аб розьніцы і навет процілежнасьці інтарэсаў сялян і работнікаў — у апошнім сваім нумары (перадавіца „Сялянскія Справы“) проста б'е сама сябе, бо кажа, што селянін і работнік — саюзьнікі. Трошкі запозна прышлі нашы сельсаюзьнікі да такога пераканаьня, калі спракудзіліся ўжо зусім у вочах масаў, якія і не паверацъ такой „зьмене фронту“ і ўрэшце яшчэ больш адхінуцца, навет тыя, якія можа й верылі, бо хто-ж будзе верыць тым, хто сёньня гавора адно, а заўтра другое? Але ня ў гэтым справа. Кожнае аздараўленьне думкі мы павінны былі-б вітаць, каб яна была-б шчырая. Але „Сялянскай Ніве“, або бракуе гэтай шчырасьці, або бракуе самога разуменьня сялянска-работніцкіх інтарэсаў.

Будзем шчырымі. За ўвесь час свайго існаваньня „Сял. Саюз“ паказаў сябе, як дробнабуржуазная група, якая ўвесь дасьлед барацьбы сялянска-работніцкіх масаў пакідала на боку, пяючы мала каму патрэбныя песьні аб сваёй закаханасьці ў сялянства. А што рабіў? Хіба толькі разьбіваў адзіны беларускі сялянска-работніцкі фронт, які бяз жаднае ўвагі на Сель.-Саюз ішоў сваей дарогай барацьбы да вызваленьня. Гэтая барацьба Сель.-Саюзу была, скажам проста, чужая, Сель.-Саюз ня бачыў яе і баяўся. Ён, затуліўшыся за плечы буржуазіі — хваліў яе парадкі, прыймаўся формамі яе свабоды (Сойм, самаўрады), уціраючы вочы, што такім спосабам сяляне здабудуць свае правы, а адначасна сварыў гэтае-ж сялянства з работнікамі.

Тое, што ясна для кожнага селяніна і работніка, гэта — патрэба весьці барацьбу за новы грамадзкі лад — гэта ў Сель.-Саюзе было адсутным. Ня відно гэтага і ў успомненым артыкуле „Сял. Нівы“. Трактуючы ўжо аб згодзе сялян і работнікаў — сельсаюзьніцкі орган мае на ўвазе гэтую згоду і супольную лінію паступаваньня ўсё ў тых-жа межах існуючага грамадзкага парадку рэчаў. Вось-жа думаем, што сельсаюзьнікі няшчыра гавораць аб згодзе, гэта толькі манэўры для захапленьня ў свой палон, хто

Касьцёлу ад Дзяржавы (скасаваньне конкордату, выдаленьня вучэньня рэлігіі з школы).

2) Зрэфармаваньня школьнага ладу ўстанаўленьнем 7-ёх клясовае пачатковае школы, як фундамэнту для 5-ёх гадовае гімназіі.

3) Зрэфармаваньня вучэньня настаўнікаў скасаваньнем сэмінарыяў, а стварэньнем пры ўнівэрсытэтах двохгадовых пэдагогічных аддзелаў.

4) Адчыненьня прадшкольляў наагул, а перш за ўсё ў фабрычных мясцовасьцях сярод пралетарыяту.

5) Адчыненьня належнага ліку прафэсіянальных школаў.

6) Мы павінны дамагацца павароту скасаванае ўрадам Грабскага адзінае пляцоўкі тэорэтычнае і практычнае працаў на школьным полі псыхолёгіі і пэдагогіі: Пэдагогічнага Інстытуту.

7) Будаваньня адноснага ліку будынкаў, для пачатковых школаў на першым месцы.

8) Павялічэньня ліку настаўнікаў згодна з патрэбаю.

9) Увядзеньня ў школы, замест цяжкіх у вымове, правапісе і граматыцы, з архаічнымі налётамі новачасных моваў — мовы эспэранто, як лёгкае і прыгожае, лёгічна „сконструяванае“ ды ня будзячае шовіністычных настрояў.

10) Мы павінны дамагацца скасаваньня клерыкальнага цыркуляра Бартэля за 9 сьнежня 1926 г.

11) — цыркуляра Дабруцкага за 29 жніўня 1927 году, што абмяжоўвае настаўніка ў грамадзянскіх правох.

12) — скасаваньня санацыйнага закону Грабскага за 22 сьнежня 1925 г. (зьменшаньне ліку дзяцей у 1-клясоўцы да 60, замест 80, у 2-кляс. да 100, замест 120, у 3-кляс. да 150 і выплаты дадатку кіраўнікам і поўнячым абавязкі кіраўнікоў за адміністрацыю школаў і роўналежныя аддзелы, залічэньня гадоў працы).

13) Трэба ўсільна, заўсёды процістаўляцца ўсялякім спробам падпарадкаваньня школьніцтва адміністрацыйным уладам (скасаваньня расп. Прэзыдэнта з 19 студзеня б. г.).

14) Абапёрця школьніцтва для нацыянальных меншасьцяў на найлібэральнейшых прынцыпах (школаў з моваю адзіна толькі беларускаю, украінскаю і г. д.) разьбіўка наша—Рэд.).

15) Павялічэньня пэнсіі настаўнікам на 35 проц. (працэнтны раўнаважнік падарожаньня спажыўных рэчаў). Эквівалент за кватэру павінен раўняцца суме, запраўды плачанай настаўнікам на гэтую мэту. Гэтак сама раўнаважнік звароту коштаў вучэньня ў прыватных школах павінен адказваць запраўднасьці.

16) Арт. 119 канстытуцыі кажа:

„Навука ў дзяржаўных і самаўрадавых школах бясплатная“. Тымчасам, насупроць канстытуцыі, урад Грабскага, каб затрудніць пралетарскай моладзі паступленьне і навуку ў унівэрсытэтах, накладае на студэнтаў высокія аплаты, ня могучы плаціць якіх, бедная моладзь адмаўляецца ад вышэйшае асьветы. Дамагаймася, каб гэты ганьбячы закон скасаваць.

17) Край, які мае 50 проц. анальфабэтаў (няпісьменных—Рэд.) павінен мець закон аб пазашкольнай асьвеце. Павінна быць прымусовае вучэньне старэйшых: анальфабэтаў, паўанальфабэтаў, паваротных анальфабэтаў.

Спытаецеся, скуль браць вялізныя сумы на вышэйпералічаныя патрэбы? Адказваю, што рэалізаваньне гэтых мэтаў будзе перш за ўсё памяншваць „вялікую ўласнасьць“ і ніваляваць іншыя бюджэты. Урэшце, гэта тэма вельмі абшырная і асобная“.

Гэтулькі сказаў грам. Круліхоўскі аб пачатковым школьніцтве ў Польшчы. Дарэчы будзе зазначыць, што гэта першы і хіба адзіны польскі голас, падакы дасюль за патрэбу для беларусаў пачатковае школы выняткова толькі з нашаю ў ёй моваю.

пападзецца. Далей — інтарэсаў сялян і работнікаў яны не разумеюць, а разумеюць іх так, як і ўсе „ўгоднікі“, „Сял. Партыя“, „Вызваленьне“, ППС, жадаючыя спаць на мягкай буржуазнай пасьцельцы і крычаць за плячыма буржуазіі, што іх буржуазія душыць. Сельсаюзьнікам — або ў галаву ня прыходзіць, або яны аб гэтым ня хочуць казаць, што сваім крыкам да сялян і работнікаў памагаюць буржуазіі, бо ствараюць думку, што ня ўсе ваююць з буржуазіяй, а ёсьць, выбачайце, сяляне, якія гатовы тушыць пажар барацьбы.

Ніякае „зьмены фронту“ ня бачым, а бачым — простую дэмагогію.

З Т-ва Бел. Школы.

Падзякі.

1) 16 і 19 VIII г. г. Вяліка-Грынкоўскім гуртком была зладжана квэста ў м. Сьвіслачы і бліжайшых вёсках. Сабрана было 89 зл. 37 гр., 75% гэтае сумы пайшло на карысьць бібліятэкі-чытальні ім. Івана Луцкевіча пры Вяліка-Грынкоўскам гуртку, а 25% на карысьць пацярпеўшых ад стыхійных няшчасьцяў. Усім ахвярадаўцам, а таксама асобам прынімаўшым удзел у ладжаньні квэсты, Управа гуртка складае шчырае дзякуй.

2) Управа гуртка Т-ва Беларускае Шк. ў в. В.-Грынках шчыра дзякуе наступным грамадзянам за ахвяраванныя імі кніжкі для бібліятэкі-чытальні ім. Ів. Луцкевіча ў в. Вялікія-Грынкі: Пархвен Трахімік — 2 кн., Аляксей Жук—4 кн., Андрэй Трахімік—1 кн., Анатоль Сахарчук—6 кн., Вінцук Болбот — 8 кн., Мікалай Радзіван—1 кн.

Абвестка.

3) Управа гуртка Т-ва Бел. Школы ў в. Вялікіх-Грынках даводзіць да ведама, што згодна з пастановаю сходу сяброў гуртка адбытага 1. VII г. г. і згодна § 12 Статуту Т-ва, Язэп Лабач ёсьць выключаны з ліку сяброў Т-ва, білет яго за № 8013 уняважняецца. Аб чым паведамлена Дачасная Паўнамоцная Камісія Т-ва Бел. Шк.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Два здарэньні—дзьве сьмерці.

(Пархвенаўская гм., Дзісенскага пав.).

У той час, як па ўсей Зах. Беларусі шырыцца асьвета ставяцца спэктаклі, закладаюцца гурткі Т-ва Бел. Школы, людзі змагаюцца з п'янствам, цемрай, дамагаюцца роднай школы,—наш куток сьпіць на хвалу і чэсьць бога сільных гэтага капіталістычнага сьвету.

Чаго тут толькі няма?!

Што тут ня робіцца?!

Штодзенныя з'явішчы: лаянка, мана, ашуканства п'янства, бойкі, крадзяжы, споведзь, модлы, афяры. А пасьля ізноў пачынаецца з пачатку.

І так „песьня“ без канца. — Жыві ды бога хвалі.

Асабліва калі wierny katolik i polak — то з яго і волас не спадзець. Але хай факты гавораць за сябе.

У мінулым месяцы (кастрычніку) мела мейсца ў в. Паляні наступнае: Бацька з дачкой абівалі жыта. Акалот трэба было злажыць у другое мейсца. Вось-жа бацька загадаў дачцы пераняс‌ьці, а тая вазьмі парадзь каней перавязьці — „скарэй будзе“. „Але-ж каню цяжка—відзіш якая гразь“, — адказаў бацька. Тую, вядома, за жывае ўзяло—чаму яна горшая — мусіць насіць і ей будзе легка, у той час, як каню цяжка. Дык яна станоўча зазначае: ня буду насіць! Бацька не сьцярпеў. Як гэта яго вядомага пабожнасьцю ў ва ўсей пархвенаўшчыне чалавека, які ў пархвенаўскім касьцёле распараджаецца, як дома і ходзіць абчапаўшыся рознага роду мадалікамі і ружанцам — яго ўласная дачка ня слухае. — Дык за палена.—A czcij ojca i matkę swoją. Я табе!“... Ды паленам. Тая ходу — ен за ей. Дзяўчына ў хату і заперлася,—думаючы, што ня ўлезе, а тым часам можа злосьць адойдзе. Але дзе там—выламаў дзьверы і давай „частаваць“. Аднак і ў хаце бацьку не пашанцавала накласьці ў волю. Дзяўчына вырвалася ды ўцякаць, бацька даганяць. Яна ў сьвіран і бацька тут.

Што дзеелася ў сьвірне, Bóg raczy wiedzieć ды бацька—К.

Праз пэўны час па тым, як бацька за дачкой бег у сьвіран, з'явіўся ен на сяле. Сядзіць і маўчыць, але гэткая важнасьць — няхай сядзіць—то-ж не пяршынь ў весцы „па сяле“ хадзіць. Толькі, вось час ад часу вочы трэць. Гэта кінулася ў вочы прысутным. Пытаюць.—„Што табе? чаму трэ вочы?“ І пачулі адказ: — „Гэта б...ь павесілася ў сьвірне“. Кідаюць пытаньне: „Чаму не ратаваў?“ Але ўжо, ня слухаючы адказу, сьпяшаць на мейсца выпадку. Спрабавалі калыхаць—дзе там — адубеўшы. Мертвага не ўваскрасіш — дык і перасталі. Замальдавалі паліцыі. Тая прыехала ноччу з доктарам Базарэўскім, які глянуўшы праз дзьверы штось піснуў і загадаў хаваць. — Абы скарэй „канцы ў ваду“.

Ні ўскрыцьця, ні „баданьняў“ ні „dochodzenia“.

Праўда, радня (па мацеры) была пастрашыла, але, як толькі К. згадзіўся аддаць маемасьць памершай — пасаг першай жонкі,—замоўкла.

Ня зышоў гэты выпадак з людзкіх языкоў, як лучылася іншае здарэньне. На гэты раз панскі найміт Ч.-дварняк Слатвінскага як подлы трус навес цаглiной сьмяроны ўдар у патыліцу wstrętnemu białorusinu Ф. Паўловічу за тое, што хлопцы з в. З. з пагардай глядзелі на яго (Ч.) Ч. зазначыў пры гэтым „я—jestem polak, папольску розмавям, служен у панув, знам дэлікацыі“.

Але гэтага было мала паном палажэньня, ім яшчэ хацелася выкарыстаць пасьледнія хвіліны жыцьця, акалечанага Ф. Паўловіча, каб затушаваць выпадак забойства.

Калі ў напярэднім выпадку досьць было Базарэўскага, цяпер змусілі Ф. П. вязьці бездарожжай у Докшыцы да доктара мэдыцыны, які сьмяроны ўдар залічыў за лекке ўдэжэне.

Ня гледзячы на такі „дыягноз“, хлапец разьвітаўся з жыцьцём, але Ч. ходзіць на волі.

Цяпер у нас людзі бядуюць над ахфярамі, а навет некаторыя клянуць вінавайцаў, але ніхто не падумае, што тут вінаваты хаця і пасярэдня nie śleру miecz, а ręka, якая ўзгадавала такіх катаў і стварыла варункі, спрыяючыя ім.

М. С. з Барчавіны.

Сабачая вернасьць!

(Браслаўшчына).

Жыхары нашае Заходняе Беларусі — пераважна бедныя малазямельныя сяляне, якія вельмі церпяць ад зьдзеку з боку ўласьнікаў вялікіх абшараў.

Найгорэй дык гэта бывае з жывёлінай. Ледзь узыйдзе сялянская жывёліна на панскае поле, як зоркае вока „вернага“ панскага слугі адразу заўважыць сваю ахвяру. Ну, а тады ўжо вядомая песьня. Трэбуецца „вынагродзэньне“ за „шкоду“ — 10 або 15 зл. Ня можаш заплаціць, скасі дзесяціны 3 жыта ці канюшыны. Прасі, малі пана, колькі хочаш — нічога! Ні якіх „тлумачэньняў“ не прыймаецца. Бэзапэляцыйна!

У адным з такіх маёнткаў — Бяльмонтах, ёсьць нядаўна паступіўшы аканом Баркоўскі. Заўсёды п'яны (каб заглушыць астаткі свайго сумленьня), узброіўшыся рэвальвэрам, гэты „верны слуга“ са сваім „атрадам“ белых нявольнікаў робіць напады на вясковых начлежнікаў, дэманструючы перад імі аружжам. Для „вернага слугі“ ня існуюць граніцы, будзь гэта дворнае, ці то вясковае поле — усё роўна, абы толькі папалася жывёліна яму на вочы.

Гэтак у нядзелю 14.X робячы абход, Баркоўскі ўбачыў каня, пасучыся над самымі гародамі вёскі Ахрэмаўцы. Ня думаючы доўга, забраў яго і павёў у двор. Убачыўшы гэта, уласьніца каня Юста Максімовіч (бедная ўдава) думаючы, што гэта зладзей крадзе яе каня, падняла крык, і дагнаўшы Баркоўскага пачала адбіраць ад яго. Але-ж дзе там, слабая жанчына можа здужацца з гэтакім шулой — мужчынай. Ды і Баркоўскі не паглядзеў на тое, што перад ім жанчына: як дзікі зьвер, кінуўся на безбаронную ахвяру і моцна зьбіў яе па твары і грудзёх, ад чаго Ю. Максімовіч акрываўленая і бяспритомная рынулася на зямлю. У абароне сваёй маткі ўступіўся яе нялетні сын Астафей, але і яго пасьцігла тое самае, што й матку.

На крыкі пакрыўджаных пачалі зьбягацца суседзі, якія адбаранілі зьбітых і акрываўленых Максімовічаў ад раз'юшанага „вернага слугі“. Абкіданы бабамі гразёй і затуканы, як воўк, утуліўшы хвост, паплёўся Баркоўскі ў двор, пагражаючы сялянам. Ходзяць чуткі, нібы Баркоўскага за „сабачую вернасьць“ паны хочуць шчодра нарадзіць.

„Селянін“.

Аднаго ратуюць,—другога руйнуюць.

(Браслаўшчына).

21.IX у мястэчку Ікажні ўспыхнуў пажар, аб якім была павядомлена і Браслаўская Пажарная Стража. Ня маючы ўласных коняў, пажарнікі затрымлівалі на дарозе сялянскія фурманкі, выкідваючы з воза (калі сапраціўляўся) гаспадара і сеўшы па 5 — 6 чалавек на воз, ляцелі ратаваць ад няшчасьця аднаго бліжняга, а тым часам руйнуючы другога.

Бо дзе-ж гэта відана, каб сялянскі заморany конь мог-бы праляцець 14 кілямэтраў галёпам.

Гэтак жыхар вёскі Ахрэмаўцы, Язэп Максімовіч ледзь адхапіў свайго каня пасьля гэткага „бегу“, аж некалькі дзён ня мог на ім рабіць.

Чым затрачваць грошы на духавыя аркестры, ды на розныя балі і забавы, ці ня лепей было-б купіць для пажарнікаў тройку добрых адпаведных коняў, а ня мучыць і без таго замучаных цяжкаю працаю сялянскіх коняў. Можа тады і сяляне глядзелі-б на пажарнікаў, як на праўдзівых абаронцаў іх маемасьці а не наадварот.

„Селянін“.

Зьдзек паноў-абшарнікаў над парабкамі.

(Вялейшчына).

Дзякуючы нашай нясьведамасьці, паны абшарнікі, што раз то больш, пачалі зьдзекавацца над намі, бо трэба з сумам прызнацца, што ў нас сялянства і дворныя парабкі—пакорныя паном-абшарнікам, бы тыя цяляты.

Не даплаціў пан парабку за службу — парабак маўчыць; скрыўдзіў пан парабка ў чымсь-колечы—парабак таксама маўчыць, а навет часта рукі цалуе пану, і перапрашае, бо баіцца, каб той не прагнаў яго часам са службы. Паны-ж, убачыўшы такую „пакорнасьць“ сваіх „рабоў“, яшчэ больш зьдзекуюцца і крыўдзяць нас.

Дзеля прыкладу прывяду тут адно здарэньне, спаткаўшае кухарку Веру Мамчыц, маючы мейсца ў маёнтку Ганута абшарн. Валовіча, у Вайстамскай гміне і то ў тым маёнтку, дзе парабкоў, ці наагул дворных работнікаў налічваецца каля 40 асоб, каторыя, разумеецца, будучы добра арганізаваныя ў свае „Прафэсіянальныя Саюзы“ — маглі-б даць адпор тым гвалтам, якія над імі спраўляюць розныя rzondcy, ды „kierownicy“ маёнтку.

Было гэта так:

Калі кухарка Вера Мамчыц падавала „rzondcy“ маёнтку п. Міхалу Багушэўскаму ежу і ў чымсь яму не дагадзіла, дык Багушэўскі, ні з сяго ні з таго, так зьбіў бедную дзяўчыну, што яна навет абамлела і яе ледзь адратавалі ад сьмерці.

А ціж гэта адзін такі толькі прыклад?!

Ці мала ёсьць у нас падобных здарэньняў з парабкамі?!

Гэта, як ня трэба лепш, сьведчыць аб тым, што парабкам трэба арганізавацца ў саюзы, каб змагацца з злачынствамі.

„Сябра з вёскі“.

Навокал унутранага развалу П. П. С.

Двудушнасьць ППС, гэтага ўваскросшага паганскага двутварага бога Януса, ня гледзячы ні на як найстараньнейшае маскаваньне яе, патрошкі выходзіць наверх — на відавок ўсяго шырокага грамадзянства. Самым ходам гісторыі неяк разгортваецца плесьня пэпэсаўскага сацыялізму і з пад яе паказваецца запраўднае аблічча гэнае партыі ППС, гэта нішто іншае, як група палітычных спэкулянтаў, апэруючых дзеля абдурваньня працоўных масаў сацыялістычнымі лёзунгамі; яна выпрабаваны лёкай буржуазіі, які дзеля мэтаў апошняй сьведама разьбівае арганізаваны сялянска-работніцкі рух, каб адцягнуць працоўную клясу ад яе ідэалаў і ад змаганьня за яе штодзенныя патрэбы.

У верхаводаў партыі ППС ўзмацніўся кірунак, які лічыць польскую санацыю за „чысты“ сацыялізм і дамагаецца адкрытага супрацоўніцтва з ею.

Тварцом гэтай групы ёсьць былы лідар ППС, — цяпер міністр (!) Марачэўскі і цяперашнія паслы з ППС. Гэтая група ад 10 кастр. г. г. выдае сваю газэціну „Пшэдсьвіт“. Перадавіца першага нумару яе заяўляе, што яе заданьне — гэта кансалідацыя „сацыялістычнага“ руху. Далей „Пшэдсьвіт“ піша, што ППС адыграла вялізную ролю ў Гісторыі Польшчы і што мае вялізныя здабыцьці дзеля работніка, а каб мець іх яшчэ больш, дык трэба йсьці з тым, хто найбольш аб іх руліцца—з Пілсудскім (!). У гэтым кірунку „Пшэдсьвіт“ і буцзе весьці сваю працу.

Заяўленьне „Пшэдсьвіту“ цэнтральны орган ППС „Роботнік“ спаткаў вострай крытыкай, і заявіў, што не пазволіць на разьбіваньне партыі—на разьбіваньне яе „нізоў“ і што дзеля гэтага скліча ўсепартыйны кангрэс у Сасноўцы, на якім і асудзіць „гэрэтыкоў“.

Але і група „Пшэдсьвіту“, назваўшая сябе „Рэвалюцыйнай Фракцыяй ППС“, адказала тым жа самым — і яна абвясьціла, што скліча ў тых жа самых днёх, што й ППС (ў пач. г. лістапада) ўсепартыйны зьезд ППС ў Катавіцах, на якім асудзіць ППС, а гэтым самым далучыць да сябе яе партыйныя нізы—нясьведамых сялян і работнікаў.

Гэтыя кангрэсы — змаганьне ППС-аў за працоўную душу адзін у Катавіцах, другі ў Сасноўцы — ўжо адбыліся; каждая з гэтых партыяў цягне гэтыя „душы“ да сябе, валячы пярунамі ў свайго праціўніка.

А запраўды, паміж самай ППС і групай Марачэўскага няма ані-якай прынцыповай розьніцы, а толькі тактычныя непаразуменьні. Як адна, так і другая аднолькавы. У іх аднолькава на месьце сацыялізму стаіць цьвярды царскі „ўра-патрыётызм“, які заўзята змагаецца з барацьбой працоўнай клясы за яе сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Дзеля гэтага і заява „міністэрскай“ групы аб кансалідацыі сацыялістычнага руху ёсьць ня што іншае, як заява барацьбы з ім.

Закладайце свае, беларускія, каапэратывы.

Каапэрацыя — гэта шлях да перабудовы грамадзкага ладу на новых, больш справядлівых падставах.

Каапэрацыя — гэта адзін з відаў сацыяльнай барацьбы працоўных за лепшую будучыню.

Дык твары каапэрацыю і абмінай прыватнага гандляра, як заразу!

З газэт.

„Słowo“ аб украінцах.

У зьвязку з апошнімі падзеямі ў Львове „Słowo“ застанаўліваецца на адносінах ўусходняй Галіцыі. І тут мусім адзначыць, што манарх. „Słowo“ ад часу да часу рашаецца сказаць некалькі шчырых слоў. Там, паміж іншым, пішацца:

„Ня можна, аднак, дапусьціць, што кансэквэнтнае ігнараваньне Польшчай украінскіх пастулятаў была толькі сьляпым выкананьнем нацыяналістычнай дактрыны, ці помстай за страты, панесеныя ў часе польска-украінскіх бітваў. У пастуляце адмаўленьня ўкраінцам унівэрстытэтаў, субвэнцыі на каапэратывы, украінскай мовы на „ўжэндовых“ актах і г. д.—была гэная думка, апрача свайго залагоджэньня, лёгічна праведзена. Думка гэта—магчымасьць адарваньня ўкраінскіх масаў ад іх павадыраў і „зрабеньне“ з іх якойсьці новай нацыянальнасьці, якая назвалась бы „русінам“, але якая думала-б, гаварыла, чытала і пісала папольску. Тут пачынаецца трагічная ілюзія“.

Так навет „Słowo“ мусіць прызнаць, што ідэя аб палёнізацыі ўкраінцаў — трагічная ілюзія.

Мы, з нашага боку, дадамо, што тэй самай трагічнай ілюзіяй зьяўляецца вера ў тое, што ўдасца калісь палёнізаваць беларусаў.

Паштовая скрынка.

Я. Багдановічу вёска Канюхі, Баранавіцкага пав. Інфармацыі, як залажыць спажывецкі каапэратыў будуць, зьмешчаны ў газэце. Статуты, дэклярацыі і брашура М. Манцэвіча будуць Вам высланы.

Закладайце, паважаны грамадзянін, каапэратыў у сваёй вёсцы і заахвочвайце селян у суседніх ваколіцах, бо ў гэтым вялікая будучыня нашага эканамічнага і культуральнага стану.—**Свайму Б.** Вашу карэспандэнцыю атрымалі. Дзякуем. Пішыце больш. Старайцеся, як найкарацей. — **Піліпу Красько.** Карэспандэнцыю атрымалі. Зьмесьцім у наступным нумары.—**Ю. К—вічу.** Вельмі добра, што вы стараецеся закладаць каапэратывы і заклікаеце да гэтага ўсіх. Карэспандэнцыю зьмесьцім. Верш патрабуе апрацоўкі. Зьвярнайце ўвагу на рытм.—**Янку Нядольніку.** Ваша карэспандэнцыя да друку не падходзіць. Пішыце ляпей аб тым, як ваша моладзь праводзіць вольны час, чым займаецца, якія ў вас існуюць арганізацыі і праз каго яны апанаваны.—**„Нетанцуючаму“**—Вы, як [illegible] надта сумуеце над тым, што ў Вашай вёсцы п'юць гарэлку і ня цікавяцца жыцьцём. Сумаваць, аднак, ня трэба. Мы мусім ведаць, што трыманьне ў цемнаце працоўных—гэта мэта пануючых клясаў. І сум тут нічога не паможа. Трэба клікаць працоўных, а перад усім моладзь, да арганізацыі да культурна-асьветнай працы, тлумачыць ім, хто яны такія і да чаго павінны імкнуцца. Карэспандэнцыю Вашу зьмесьцім у бліжэйшым нумару.—**Шапніцкаму.** Пішыце аб больш балючых пытаньнях і выразьней. Высланая Вамі карэспандэнцыя да друку не падыходзіць.—**Сяліцкаму.** Фэльетон Ваш да друку не падходзіць, бо ў ім не закрануты зусім сучасныя балючыя пытаньні ў жыцьці працоўных. Пішыце ляпей карэспандэнцыі.—**С. Сямчонку.** Вашую просьбу памагчымасьці споўнім. Верш добры, але патрабуе шмат апрацоўкі.—**Унуку Тумашоваму.** З Вашых карэспандэнцыяў скарыстаем. Пішыце больш.—**А. Пазьняк.** Вашы карэспандэнцыі вельмі добрыя. Дзякуем. Зьмесьцім у наступны нумарох. Пішыце карацей і давайце больш фактаў. — **Хільману.** У Вашай карэспандэнцыі вельмі шмат слоў, але мала зьместу. Трэба старацца пісаць, як найкарацей. З „Церняў і Мараў“ скарыстаем. — **Чуткаму.** Скарыстаем.

Абвестка.

Гэтым даводзіцца да ведама Акружныя Управаў і Гуртkoў Т-ва Бел. Школы, што 9 і 10 сьнежня 1928 г. у Вільні ў памяшчэньні пры вул. Сьвятой Ганны № 2, адбудзецца **Агульны Сход** Т-ва Бел. Школы з наступным парадкам дня:

1. Выбары Прэзыдыуму Сходу,
2. Выбары Мандатнае Камісіі,
3. Выбары ганаровых сяброў,
4. Даклад аб дзейнасьці Таварыства,
5. Даклад з месц,
6. Рэфэрат „Праграмы Працы Т-ва“,
7. Рэфэрат „Пазашкольная Асьвета“,
8. Рэф. „Белар. Асьвета й Самаўрады“,
9. Рэф. „Значэньне Т-ва Бел. Школы для Беларускага Народу“,
10. Выбары Галоўнае Управы,
11. Выбары Наглядная Рады,
12. Рэф. „Беларуск. мова й літэратура“,
13. Рэф. „Праца жанчыны ў Т. Б. Ш.“,
14. Рэф. „Каапэрацыя ў вёсцы“,
15. Рэф. „Аб Радыё“,
16. Экскурсія ў Музэй ім.

Вільня 22.XI 1928 г.

Дачасная Паўнамоцная Камісія.

Рэдактар-Выдавец: В. Філіповіч.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.